ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'90

ЧАЦВЕР
13 ВЕРАСНЯ
№ 23(1652)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ШТО ЗМЯНІЛАСЯ?

## «Чакаем загад...»

*ТАК АДКАЗАЎ НА НАША ПЫТАННЕ АБ НАВІНАХ ВАЕННАЙ КАФЕДРЫ ЯЕ ЗАГАДЧЫК ПАДПАЛКОЎНІК, Ю. І. БАЛЬШАКОЎ.*

У мінулым нумары мы паведамлялі, што з гэтага навучальнага года заняткі на кафедры будуць ажыццяўляцца для тых, хто падасць заяву — для жадаючых, значыць. Але пакуль такое абяцанне патрабуе ўдакладнення, бо распаўсюджваецца толькі на студэнтаў, якія прайшлі тэрміновую службу ў Савецкай Арміі. Для ўсіх астатніх «ваенка» застаецца АБАВЯЗКОВАЙ ЧАСТКАЙ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ.

Заняткі ўжо пачаліся. Юрый Ільіч запэўніў, што наведванне іх — амаль што стопрацэнтнае. Корпус да пачатку новага навучальнага года адрамантаваны, абноўлены. Цалкам пераабсталяваны два хімічныя класы, з'явіліся новыя — баявога выкарыстання і артылерыі.

Доўгачаканы загад з Масквы (Дзяржкамітэта па народнай адукацыі сумесна з Міністэрствам абароны СССР), які дазволіць добраахвотна наведваць заняткі на ваеннай кафедры ЎСІМ, магчыма, прыйдзе ўжо ў бягучым месяцы. Чакаем!



ПАКУТЫ ПА «БУЛЬБЕ»

## Сам не паддавайся

Універсітэцкія вестыбюлі яшчэ помняць гэтых хлопцаў і дзяўчат, што так змянілі іх жнівеньскі пасляэкзаменацыйны настрой, запоўніўшы ўсю магчымую плошчу рукзакамі, чамаданамі, гітарамі і ажыўленымі размовамі. Гэта яны, нашы самыя малодшыя, «першаклашкі» і другакурснікі. Ці цёпла ім цяпер у памяшканнях, выдзеленых для жылля? Ці ў добрым настроі прачынаюцца яны ціхімі вясковымі ранкамі?

Ад'язджала большасць з іх весела. Усміхаліся нават тыя, хто 5 верасня, прыйшоўшы да 8.30, чакаў свайго ад'езду спачатку да 10.30, потым да 12.30... Затое была магчымасць некалькі разоў збегаць на вуліцу за апошнім у гэтым месяцы марожаным!

Пэўна, з той жа радасцю ад'язджалі на «бульбу» і былыя студэнты-рамантыкі, усе, без каго не абышлася «барацьба за ўраджай». Сёлетнія да яе не рыхтаваліся, спадзяеючыся на леташнюю добраахвотнасць. Ці моцна абураюцца гэтым? Запытаемся ў каго-небудзь з іх, якія асабістыя правы яны разлічваюць адстойваць. Напрыклад, вось у той дружнай кампаніі ля вакна. Знаёмімся. Наташа Бучнева, Оля Салавей, Жана Хелюк, Лена Іванова, Ядзя Лашчыліна і Улад Данішэўскі, з 9-й групы 2-га курса мехмата:

— Мы едзем у Круглянскі раён Магілёўскай вобласці. Нас запэўнілі, што там узровень радыяцыі меншы, чым у Мінску.

— Дазіметр узяў хто-небудзь з вашых?

— Не...

— А колькі разлічваеце атрымліваць грошай?

— Не ведаем, колькі заплоцяць.

— Вам павінны плаціць не менш чым 1 рубель і 20 капеек у дзень — чулі пра гэта?

— Праўда?! Дзякуй, што паведамілі.

Застаецца спадзявацца, што за час, пакуль ехалі ў электрычцы, мехматаўцы не страцілі надзею на лепшае. Тым больш, што яны аказаліся больш удачлівымі, чым іх калегі з юрфака.

Тыя збіраліся ў Мядзельскі раён. Ужо расселіся ў трох аўтобусах, дачакаўшыся іх... Але прыйшлося зноў выйсці пад дождж. І — пайсці дадому. 5 верасня толькі 47 з юрфакаўцаў заехалі на сваё месца работы. Ад'езд яшчэ 100 з іх быў адкладзены да 8 верасня. А 5-га тры аўтобусы з калгаса «Бальшавік», кожны коштам 150 рублёў, вярнуліся «дадому» паражняком.

І ўсё таму, што не хапіла дагавора паміж універсітэтам і гаспадаркай. Неабходнасць яго прадугледжана сумеснай пастановай Дзяржкампрацы СССР, сакратарыята ВЦСПС і Бюро ЦК ВЛКСМ ад 10 жніўня 1990 года. Дагавор гэты — цяпер не тая паперка, якую любяць трасці ва ўзнятай руцэ бюракраты, а той адзіны дакумент, што замацоўвае правы студэнтаў і сапраўды абараняе іх ад свавольства гаспадарнікаў.

Але ж дагавор, не падпісаны ў час, пачаў сваё існаванне для сотні гэтых жа студэнтаў з таго, што нашкодзіў. Не «па сваёй волі», а таму, што многія адказныя асобы па-ранейшаму адносяцца да ўсіх дакументаў толькі як да паперак.

ХУТКУЮ ДАПАМОГУ!

## ...Асадзі назад!

Нарэшце знайшлася палачка-выручалачка — на дапамогу прыйшлі камп'ютэры. Не пабаяліся супрацоўнікі фундаментальнай універсітэцкай бібліятэкі дадатковых цяжкасцей: ні яшчэ большай цесняты (і дагэтуль плошчаў катастрафічна не хапала, а тут давялося пацісну цца, каб даць месца машынам), ні ўшчыльнення рабочага графіка (акрамя ранейшай работы даводзіцца «займацца» і з ЭВМ). Усе марылі пра той час, калі чытач не будзе чакаць адказу на сваё запытанне гадзіну і больш, а атрымае яго праз некалькі хвілін.

Але, на жаль, як гэта часта ў нас здараецца, планы напалеонаўскія, а зводы Кірылы-пячніка. І зараз тут не разумеюць, чаму яны павінны большасць часу траціць не на непасрэдную работу, а на бессэнсоўныя хаджэнні і выкленчванні чагосьці? Напэўна, тым, ад каго залежыць лёс бібліятэкі (а гэта значыць, кожнага студэнта, аспіранта, супрацоўніка, выкладчыка), трэба смялей і больш адкрыта глядзець на яе праблемы, а не віжаваць у замочную шчыліну. Камп'ютэрызацыя бібліятэк — ужо нават не сённяшні дзень.

Здаецца, яны многага не патрабуюць — усяго толькі адзін тэлефонны нумар. Без яго — як без рук. Набылі відэатон — абышоўся ён універсітэту ў капеечку. А аддача? Яе пакуль няма і невядома калі будзе. Вось гэты самы дэфіцытны тэлефонны нумар і не дазваляе чытачам атрымліваць самую разнастайную інфармацыю (відэатон звязаны з банкам дадзеных ТАСС). Таму, хто абавязаны выдзеліць яго,— рэзалюцыя рэктара не ўказ. А пра ахвяраванне нумара якімсьці падраздзяленнем і размовы няма — добраахвотнікаў не знайшлося.

А можа справа варта ахвяр?

ПАМЯТКА

## «Качайце правы»

*МІЖ ІНШЫМ,*

*недапушчальна прыцягваць студэнтаў на сельгасработы з павышаным пылавыдзяленнем (уборка бульбы, збожжа, ільну) на тэрыторыі з узроўнем гама-фону звыш за 20 мікрарэнтген у гадзіну ці ўтрыманнем радыеізатопаў болей за 1 Кu/км$^2$, а таксама на работы, не звязаныя з уборкай сельскагаспадарчай прадукцыі;*

*аплата працы непаўналетніх, калі ім не зніжаюцца нормы выпрацоўкі, вядзецца па здзельных расцэнках з даплатай па тарыфнай стаўцы за час, на які скарачаецца працягласць іх штодзённай работы;*

*дадатковая аплата за аптымальныя тэрміны ўборкі на працягу 20 дзён масавай уборкі бульбы вядзецца па расцэнках, павялічаных на 15 працэнтаў;*

*можна патрабаваць «разлік натурай» — сельскагаспадарчай прадукцыяй;*

*пры парушэнні гаспадаркамі асобных умоў дагавора — універсітэт мае права адзываць студэнтаў на заняткі.*

ДА 500-ГОДДЗЯ Ф. СКАРЫНЫ




На беларускай зямлі ўзгадавалася нямала слаўных сыноў, якія зрабілі важкі ўклад у скарбонку агульначалавечай культуры. Сёлета мы адзначаем 500-годдзе аднаго з іх, слаўнага палачаніна Францішка СКАРЫНЫ.

СКАРБОНКА СКАРГАЎ

## Халява ёсць!

**УРАДАВАЯ ПАСТАНОВА АБ НЕАБХОДНАСЦІ АКАЗАННЯ ДЗЕЙСНАЙ ДАПАМОГІ ВА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ НЕ ПРАДУГЛЕДЖВАЛА ПЕРАЎТВАРЭННЯ СТУДЭНТАЎ У НЯВОЛЬНІКАЎ ПА АСАБІСТАМУ ЖАДАННЮ. ДАБРАВОЛЬЦЫ-«АПАЛЧЭНЦЫ» АТРЫМАЛІ ЗАКОННЫЯ ПРАВЫ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ НА ЎПЭЎНЕНАСЦЬ, ШТО СЕЛЬГАСРАБОТЫ НІЯКІМ ЧЫНАМ НЕ ПАШКОДЗЯЦЬ ІХ ЗДАРОЎЮ.**

У чым гаспадарнікі шчыра і афіцыйна запэўнівалі. Сёння студэнтам даводзіцца пажынаць плады ўласнай даверлівасці: атрад другога курса юрыдычнага факультэта, што працуе ў калгасе «Чырвоны сцяг» Валожынскага раёна (в. Доры), вымушаны звярнуцца за дапамогай у санэпідстанцыю ў вырашэнні пытання аб перавышэнні допушчальных нормаў радыяцыйнай забруджанасці.

Санкцыяніраванне «бульбы» на высокім узроўні не адыгрывае ролі для прадстаўнікоў саўгаса «Дрычанскі».

— Колькі можна самім напрошвацца на работу? — абураецца кіраўнік атрада біяфака Сяргей Аляксандравіч Матусевіч.

Сорак студэнтаў з 3 па 7 верасня не паспелі забяспечыць ні «фронтам» работ, ні нармальным харчаваннем. Паколькі дырэктар у адказ на запытанні толькі паціскае плячыма, памочнікі вырашылі перадыслацыравацца ў саўгас «Міханавічы».

**ВЯДУЧЫЯ РУБРЫКІ «СКАРБОНКА СКАРГАЎ» ГАТОВЫ ПРЫЙСЦІ ВАМ НА ДАПАМОГУ Ў ВЫРАШЭННІ КАНФЛІКТНЫХ ПЫТАННЯЎ ПАМІЖ СЕЛЬГАСАТРАДАЎЦАМІ І ПРАДСТАЎНІКАМІ ГАСПАДАРАК. ДАСТАТКОВА НАПІСАЦЬ НАМ НА АДРАС: Г. МІНСК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» ЦІ ПАТЭЛЕФАНА-**

# СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ БАЙЦОЎ

*Адразу гэта не ацэніш. Хоць будзеш безупынна ўспамінаць да наступнага лета, чакаючы новай сустрэчы. Потым пройдзе год, другі... Вакол цябе з'явяцца іншыя людзі. Цябе незаўважна напоўняць іншыя пачуцці або рацыянальныя выкладкі замест іх. І доўга-доўга будзе не да тых успамінаў. Але аднойчы — пахі! музыка! — яны лепш за ўсё захоўваюць самыя яскравыя ўражанні і самыя моцныя адчуванні. Таксама, як фотаздымкі. Усё наваліцца разам, такое ж неабдымнае, як тое, што пакідае ў памяці дзяцінства. І будзе прыходзіць сярод шэрых дажджоў штодзённасці, настойліва запэўніваючы: НЕШТА ТАКОЕ ЯШЧЭ АДБУДЗЕЦЦА У ЖЫЦЦІ!..*





## Сэканомілі на дзяржаве?

Калі ў маі гэтага года быў надрукаваны Закон СССР аб падаходным падатку з грамадзян, большасць студэнцкіх атрадаў ужо былі гатовыя да працы. Але і тыя будатрадаўцы, роздум якіх перарвала навіна аб неабходнасці ўносіць падатак, былі абаронены ад такой небяспекі. Атрады, якія працавалі на тэрыторыі Беларусі, падатак не плацілі — дзякуючы адпаведнаму рашэнню Савета Міністраў БССР, прынятаму па ініцыятыве рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў. Галоўным аргументам на карысць такога рашэння з'явіўся пункт 4 артыкула 4 Закона, які прадугледжвае магчымасць вызвалення асобных катэгорый плацельшчыкаў ад уплаты падатку.

У рэспубліканскім штабе падлічылі: калі б падатак здымаўся з атрадаў у мінулым годзе, яго агульная сума па Беларусі склала б прыкладна 600 тысяч рублёў — нядрэнная прыбаўка ў дзяржаўны бюджэт! Дык ці можна лічыць правільным рашэнне Савета Міністраў? У штабе перакананы: безумоўна! Бо яно абараняе студэнтаў як адну з найменш забяспечаных катэгорый нашага насельніцтва. Праца ў летніх атрадах для іх — часцей за ўсё асноўная крыніца самафінансавання. Калі размеркаваць сярэдні заробак будатрадаўца — прыкладна 600 рублёў — на ўсе месяцы года,атрымліваецца па 50 рублёў на кожны. Сума нікчэмная, а зняўшы з яе падатак... З саліднага заробку ў 1000 рублёў даволі адчувальны — прыкладна 136.

Інтарэсы студэнтаў абаронены! На бягучы год. У наступным зноў спатрэбіцца «высокае» рашэнне. Дарэчы, яно не распаўсюджвалася на беларускія атрады, якія працавалі за межамі рэспублікі, іх лёс залежаў ад вынікаў барацьбы з выканкомамі мясцовых Саветаў.

Застаецца надзея, якую выказала «Камсамолка»,— што чацвёрты пункт чацвёртага артыкула хутка будзе дзейнічаць для ўсіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў краіны.



НЯДРЭННА Б ЗАПОМНІЦЬ

## ТЫ Ж МЯНЕ ПАДМАНУЛА

Смела можаце выказаць такі папрок той арганізацыі, на якую працавалі ў буд-, сельгас- ці педатрадзе, калі вашы прафсаюзныя ўзносы пералічаны на яе рахунак. І ў наступны раз спасылайцеся, калі ласка, на пастанову прэзідыума ВЦСПС ад 3 жніўня 1988 года, якая абараняе правы вашай навучальнай ўстановы: «Членскія ўзносы з заработнай платы студэнтаў вышэйшых, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, якія працуюць у студэнцкіх атрадах, лагерах працы і адпачынку і праходзяць вытворчую практыку, выконваюць навукова-даследчыя, гасдагаворныя і іншыя віды работ у саставе калектываў студэнтаў і навучэнцаў, бяруцца ў бухгалтэрыі прадпрыемства, установы, арганізацыі, якія прадастаўляюць работу, і пералічваюцца на разліковы рахунак прафкома студэнтаў, навучэнцаў вучэбных устаноў (аб'яднанага прафкома супрацоўнікаў і студэнтаў), які ўказваецца ў дагаворнай дакументацыі на выкананне работ».

Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў унёс пункт аб перадачы прафсаюзных узносаў навучальным установам у тыпавы дагавор. Але не ўсе атрады звярнулі на гэта ўвагу. І не ўсе прафкомы паклапаціліся пра свае інтарэсы...

Студэнцкі прафком нашага універсітэта ў гэтым годзе яшчэ не атрымаў прафсаюзныя ўзносы будатрадаўцаў. Але вялікая скарбонка для іх ужо падрыхтавана. Праўда, доўга захоўвацца там гэтым грашам не давядзецца — яны вельмі патрэбны. Напрыклад, прафком цяпер мае магчымасць прадастаўляць студэнтам усе пуцёўкі як 30—50-працэнтныя. Дзякуючы, у тым ліку, і студэнцкім атрадам...



Я МЯРКУЮ...

## «Дайце заваліць універсітэт садавінай!»

*Віктар Віктаравіч ЖУКАЎ — толькі што з Малдовы. Камандзір занальнага штаба студэнцкіх атрадаў са стажам. Перш за ўсё спытаем яго... пра здароўе.*

**— Віктар Віктаравіч, наколькі ўдачна скончыліся для вас інцыдэнты з мясцовым насельніцтвам? Колькі разоў давялося ў сапраўдную бойку ўступіць?**

— Вы памыляецеся, калі думаеце, што такія выпадкі былі. Палітычнае становішча ў Малдавіі — Малдове, дакладней,— наогул не закранула нашы атрады. Хоць асцярогі менавіта наконт гэтага перашкодзілі паехаць на работу ў рэспубліку многім студэнтам.

І гаспадарнікі, і мясцовае насельніцтва ставіліся да нас па-ранейшаму: як працуеш — такія і адносіны. Менш было толькі ўвагі з боку раённага начальства. Але гэта зразумела — яны зараз займаюцца вострымі палітычнымі праблемамі.

Нашы атрады працавалі на тэрыторыі Слабадзейскага раёна, а ён уваходзіць у тую самую Прыднястроўскую рэспубліку, што пажадала аддзяліцца ад Малдовы. Так што, можна сказаць, мы былі ў цэнтры палітычнай барацьбы. Але на нас яна, паўтараю, ніяк не адбілася.

**— Значыць, праблемы ў штаба былі прывычныя, тыя, што і ў мінулым годзе?**

— Так, і летась, і пазалетась, і яшчэ раней. Я працаваў у Малдавіі ўжо дзесяты сезон, таму магу засведчыць гэту паўтаральнасць.

Асноўнай застаецца праблема фарміравання атрадаў. І справа не толькі ў тым, што колькасць беларускіх студэнтаў, якія выязджаюць у Малдавію, знізілася з 500—600 у мінулыя гады да 350 зараз. Даўно трэба знайсці форму, якая дазволіла б па-сапраўднаму зацікавіць усіх, хто займаецца фарміраваннем атрадаў. Каб добраахвотнасць удзелу ў летняй працы не прыводзіла да таго, што многія едуць у атрады адпачываць, а не работаць. У нашай зоне ўсе працуюць па цэнтралізаваных расцэнках. Вось і атрымліваецца, што «адпачываючыя» не даюць астатнім, нават калі тых большасць, зарабіць добрыя грошы, больш чым па 300—400 рублёў члены такіх атрадаў не атрымліваюць. А вось тыя, хто аднадушна прымаюць для сябе прынцып «Мы хочам зарабіць!», прывозяць дамоў больш чым па 800 рублёў.

**— Як на гэтым фоне выглядаюць універсітэцкія атрады?**

— Вельмі пасрэдна, калі гаварыць шчыра. У гэтым годзе іх было толькі тры агульнай колькасцю крыху больш за сто чалавек: «Мара» (філфак), «Рамантык» (ФПМ), «Зорны» (фізфак). Яны не вылучаліся ні ў добры, ні ў дрэнны бок.

**— А што, неабходнасць у павялічэнні колькасці студатрадаўцаў сапраўды ёсць, будзе каму прымаць нашых студэнтаў на работу?**

— Безумоўна! У гэтым годзе ва ўсіх гаспадарках, дзе мы працавалі, атрымаўся «недавоз». Тым больш, здараюцца і нечаканасці: 140 чалавек былі вымушаны вярнуцца дадому згодна рашэнню санэпідстанцыі, бо 14 з іх захварэлі дызентэрыяй.

**— Але ж у наступным годзе дарога ў Малдову для нашых атрадаў можа быць наогул закрыта?**

— Сапраўды, ёсць пастанова Вярхоўнага Савета рэспублікі, якая забараняе ўезд сюды працоўных фарміраванняў. Але гаспадарнікі на месцах лічаць такое рашэнне непрадуманым, яны ведаюць, што ўласнымі сіламі ўраджай не сабяруць.

**— Дык трэба імкнуцца да павялічэння колькасці «малдаўскіх» атрадаў?**

— Каб гэта было так проста! Я даўно мару пра тое, каб рэктарат быў зацікаўлены ў фарміраванні атрадаў. І адначасова ставіў такую ўмову, якая можа служыць моцным стымулам,— атрыманне «жывой» садавіны і гародніны прама для універсітэта.

Я гляджу на сённяшнія гародніныя прылаўкі ў Мінску і з болем думаю, што на іх адсутнічае тое, што там, у Малдове, убіраць няма каму.

Мы б маглі заваліць універсітэт гароднінай! І летам, а ў верасні асабліва. Толькі памідораў тон 100 прывезці сюды — калі ласка. Але ж рук працоўных не хапае...

Карацей, маёй блакітнай марай застаецца час, калі кожнаму будатрадаўцу будзе ставіцца ў залікоўку «залік» або «незалік» за работу ў трэцім працоўным семестры. Хоць за гэтыя мары мяне калісьці ўжо назвалі рэтраградам...

Інтэрв'ю вяла В. БЯГУН.

# УДАТРАДАЎ

## ФАКТ ДЛЯ РОЗДУМУ

# Чужая смерць

Магчыма, з гэтай нагоды можна парадавацца: сёлета ніхто са студэнтаў БДУ у будатрадах не загінуў. Але якая розніца, чый студэнт, і ці студэнт ён наогул, калі ён загінуў? І каму гэта можа быць у радасць...

Чатыры смерці ў беларускіх студэнцкіх атрадах за гэта лета. Адна з іх — самагубства. Хлопец лёг пад колы цягніка...

Цяпер пра іншую гібель. Ці не трэба? Пачуўшы пра адну, можна здрыгануцца напэўна. А вось пра чатыры запар — наўрад ці, у кожнай наступнай чорнай навіне жудаснае адценне будзе пакрысе губляцца. Да ўсяго прывыкаем, нават да смерці зусім маладых. Што яна — бязглуздзіца або заканамернасць, зразумела толькі нейкім невядомым нябесным сілам?

Між тым, гэта сапраўды амаль заканамерна — што з чатырох дарослых людзей, якія селі ўначы на адзін імклівы матацыкл, хто-небудзь павінен быў загінуць. Так і здарылася, цуда не было. Дзяўчыну паспелі толькі давезці да бальніцы, і ўсё...

Тое, што адбылося ў Гомельскай вобласці з яе равеснікам, больш падобна на выпадак. Ён ратаваў маленькую дзяўчынку, якая танула, і выратаваў. А на сябе сіл ужо не хапіла...

Ёсць яшчэ ў вас рэшткі тых жывых эмоцый, якія дапамогуць і чацвёрты трагічны выпадак усвядоміць як СМЕРЦЬ? Гэты хлопец таксама затануў. Але не ратуючы нікога, проста захацеў купацца, хоць яго і прасілі не рабіць гэтага ў апошнія дні будатрадаўскага сезона. Не пабаяўся незнаёмай вады і загінуў літаральна напярэдадні ад'езда дадому.

Вось і ўсё. Астатнія жывыя. Помнікаў і мемарыяльных дошак для загінуўшых не будзе. Іх будуць помніць тыя, хто страціў,— сваякі і блізкія. А мы? Яны не вучыліся ў нашым універсітэце. Але яны жылі на нашай Зямлі.

## ЧЫМ ЖЫЛІ?

# Зорка «Стэлуца»





У іх была не толькі праца. Але яднала перш за ўсё яна, і характары выяўляла таксама.

— Каб пасля 1-га курса дыехаць працаваць у складзе «Стэлуцы»? Такі варыянт яшчэ пару год назад палічылі б няўдалым жартам. Звычайна з 50 чалавек студатрада сорак былі «старычкі». А цяпер... добра, калі іх набярэцца трэцяя частка ад агульнай колькасці,— дзеліцца сваімі развагаваннямі камісар «Стэлуцы» Святлана Ваўчкова.— Студэнты быццам зразумелі: навошта працаваць, калі можна адпачываць? А грошы — з бацькоў цягнуць.

Апошнія 9 год са свайго 16-гадовага існавання «Стэлуца» працуе на Стаўрапольскай зямлі, у саўгасе «Цішчанскі» Ізабільненскага раёна. І дзевяць год запар займае першае месца ў спаборніцтве зоны, сёлета — сярод 55 атрадаў. Чым займаюцца? Праполкай культур ад травы вышынёй у чалавечы рост, зборам памідораў, кабачкоў, агуркоў. Сярэдні заробак у мінулым годзе склаў 400 рублёў, у гэтым — з-за памылак бухгалтара, як сцвярджаюць атрадаўцы, — менш чым 250 рублёў.

Паказальная дэталь: пасля байцоў «Стэлуцы» на «ратным» полі не знойдзеш ніводнага памідора ці агурка. Адчуваецца гаспадарчае вока. Яго ўладальнікі працуюць не толькі якасна, але і хутка.

— Мы — матэматыкі,— гаворыць камісар,— таму стараемся і падлічваць сабранае, і разлічваць свае сілы і час. Парадкі строгія: тое, што перашкаджае справе,— прэч. Часам даводзілася цяжка. Асабліва спачатку. Але пасля працы такія песні гучаць... Навокал ведаюць пра гэты «барометр» — як спяваюць, так і папрацавалі.

Адпачываць «Стэлуца» таксама ўмее, хоць на гэта мала часу застаецца. Святы 23 лютага і 8 Сакавіка ў перакладзе на гарачае лета, дні нараджэння, традыцыйнае пасвячэнне ў байцы, дзень самакіравання, калі пасады камандзіра, камісара і брыгадзіра займаюць навічкі... У гэтым годзе саўгас арганізаваў для сваіх памочнікаў паездку ў Дамбай, жамчужыну Паўночнага Каўказа, і ў Цібердзінскі запаведнік.

...Света гартае блакнот, у які стэлуцаўцы занатавалі свае думкі, разважанні, пажаданні. Там боль развітання, успаміны аб самым дарагім, што прынёс студатрад, і жаданне зноў быць з ім на наступнае лета. На памяць аб леце-90 дакладна фіксуючымі сведкамі засталіся фотаздымкі. Не сумуйце, азіраючыся на мінулае. Было мінулае, будзе будучае!

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.

ПОЗІРК З-ПАД БРЫВА

# Засяленне... у развалiны

Як верасень, пачынаюцца (ці працягваюцца) студэнцкія хаджэнні па пакутах. Радасны настрой ад таго, што выдзелілі месца ў інтэрнаце і не давядзецца блукаць у пошуках прыстанішча (на якое, дарэчы, першакурсніку неабходна патраціць палову стыпендыі), хутка змяніўся адчуваннем безнадзейнасці. Ужо першае знаёмства з «другім домам» прымушае пакінуць ружовыя мары пра таннае жытло з усімі выгодамі і спусціцца на зямлю.

Чым жа так незадаволены студэнты, што наўкол чуюцца адны скаргі? Пабываем у інтэрнаце № 7.

На паверхах — груды плітак, мяшкі цэменту, крэйда — абавязковыя атрыбуты будаўніцтва. І такі ж будаўнічы «парадак». Гэты малюнак нікога б не здзівіў, каб мы ўбачылі яго ў сярэдзіне лета, а тут верасень, пачатак новага навучальнага года. Прабіраючыся скрозь завалы, толькі і глядзі, каб не спатыкнуцца і не ўпасці. Тым больш, што ўздзейнічае і своеасаблівы наркотык — лак для пакрыцця паркету.

— Давайце хутчэй выбірацца на паветра, а не то нас адсюль вынесуць,— захваляваўся адзін мой спадарожнік.

І мы накіраваліся ўніз. А насустрач, бы тыя мурашкі, са сваёй драгацэннай ношай — атрымалі пасцельныя прыналежнасці — адзін за адным падымаліся студэнты. Вось дзе цярплівы народ! Мы і некалькі хвілін не маглі вытрымаць, а яны збіраюцца тут жыць.

— Нічога, гэты едкі пах хутка выветрыцца,— супакоілі яны нас. — А вось як быць з тым, што другі год чакаем гарачай вады? Як памыцца, бялізну таксама не ўсю панясеш у пральню?

Хто адкажа на гэтыя пытанні (і за гэта таксама)? Каму студэнты павінны быць «удзячны» за тое, што засяляюцца ў напаўадрамантаваныя пакоі, у якіх няма на чым ні легчы, ні сесці? Што рабіць з разбітымі шыбамі, якія будаўнікі абавязаны былі замяніць і якія па-ранейшаму глядзяць на нас шматлікімі «асколкамі-вачыма». Напрыклад, у пакоі № 705 адно шкло наогул адсутнічае, а, між іншым, з дня на дзень сіноптыкі абяцаюць замаразкі. Вось і думай, студэнт, як табе не ператварыцца ў лядзяшку.

— Калі вы засяляецеся, значыць, вас задавальняюць такія ўмовы? — спытала я ў дзяўчат, якія спяшаліся на трэці паверх.

— А што рабіць?—таксама пытаннем адказалі яны.— З трох бедаў мы выбралі меншую. Інакш трэба было ці ісці часова (невядома наколькі гэта расцягнецца) на кватэру, ці ездзіць на заняткі з універсітэцкага прафілакторыя або, яшчэ горш, з прафілакторыя БПІ.

Вось так і збіраецца жыць у напаўадрамантаваных, напаўразбураных пакоях больш чым тысяча студэнтаў універсітэта. Без гарачай, а, магчыма, і без халоднай вады, бо нават тая сантэхніка, якая была своечасова ўстаноўлена, ужо паспела «намаляваць» непрывабныя рыжыя падцёкі на ніжэйшых паверхах, ад чаго са столі прама на галаву сыплецца пабелка. Без душавых, без шыб, у перапоўненых пакоях... Без той утульнасці і зручнасці, якія павінны быць у «другім доме» і якіх студэнты чакаюць не адзін год.

Каго вінаваціць у гэтым?

Адміністрацыйна-гаспадарчыя службы універсітэта, якія, пакінуўшы асабісты подпіс пад загадам рэктара № 3417-К ад 30.07.90 г. «Аб размеркаванні месцаў у інтэрнатах універсітэта і парадку засялення студэнтаў у 1990—1991 навучальным годзе», згаджаючыся закончыць падрыхтоўку інтэрнатаў да засялення да 24 жніўня гэтага года, шчыра кажучы, проста адмовіліся ад сваіх слоў?

Будаўнікоў — кааператыў «Універсал-89» (на жаль, больш дакладна выканаўцаў работ высветліць так і не ўдалося), якія, спасылаючыся на недахоп матэрыялаў, у поўным саставе на аб'екце ніколі не з'яўляліся?

Прафсаюзны камітэт, які абавязаны абараняць інтарэсы студэнтаў і больш рашуча патрабаваць выканання загада?

Саміх студэнтаў, што адважыліся на засяленне, па сутнасці, у развалiны, тым самым асудзіўшы рамонт на бясконцасць?

Напэўна, усіх разам. Бо ў кожнага з іх у гэтай інтэрнацкай эпапеі свае «заслугі». І няхай, як абяцае намеснік дырэктара студгарадка Б. Паўс, на гэтым тыдні ў «сямёрцы» ўсе студэнты атрымаюць дах над галавой (хоць у гэта верыцца з цяжкасцю — хіба толькі дах), адміністрацыі універсітэта трэба варушыцца. Амаль не пачаты рамонт калідораў, холаў, не ўстаноўлена сантэхніка. А што будзе ў студэнтаў за жыццё на «будаўнічай пляцоўцы»?

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## СЛУЖБА 03

# БЕРАЖЫЦЕСЯ ГЕПАТЫТУ

ВІРУСНЫ ГЕПАТЫТ «А» — інфекцыйнае захворванне, якое выклікаецца вірусам, паражаючым у першую чаргу пячонку. Змены ў ёй носяць запаленчы характар.

Вылучаючыся з кішэчніка і з мачой хворага чалавека, вірусы трапляюць у глебу, ежу, ваду і захоўваюцца там, пагражаючы здароўю людзей, пры тэмпературы 4°C на працягу некалькіх гадоў, пры пакаёвай тэмпературы — тыднямі. Пры награванні да 60°C на працягу 10 гадзін вірус гіне толькі часткова. Поўная страта інфекцыйнасці віруса магчыма толькі пры кіпячэнні (100°C) на працягу пяці мінут.

КРЫНІЦАЙ ІНФЕКЦЫІ з'яўляецца хворы чалавек. Заражаны небяспечны на працягу скрытага (інкубацыйнага) і пераджаўтушнага перыяду, які можа працягвацца ад 1 да 6 тыдняў (да першых праяўленняў хваробы). З моманту з'яўлення жаўтухі вылучэнне хворымі віруса ў знешняе асяроддзе рэзка памяншаецца або наогул спыняецца.

Аднак захворванне можа праходзіць у безжаўтушнай, з клінічнымі праявамі форме, або наогул без іх, што асабліва небяспечна для навакольных.

СІМПТОМЫ: павышэнне тэмпературы на працягу трох-пяці дзён (здараецца, калоціць), галаўны боль. Другім, найбольш частым сімптомам з'яўляецца слабасць, якая спалучаецца са зніжэннем працаздольнасці, хуткай стамляльнасцю ў дарослых, плаксівасцю ў дзяцей.

Вельмі характэрнае для безжаўтушнага перыяду зніжэнне апетыту, якое даходзіць да поўнага адварочвання да ежы (часцей у абед ці вячэру). Павышаецца (да рвоты) адчувальнасць да тытунёвага дыму, розных пахаў.

Найбольш непрыемным сімптомам з'яўляецца рвота: 1—2 разы ў дзень у першыя дні захворвання. Расстройствы стулу носяць кароткачасовы характар. Найбольш часта хворыя адзначаюць болі ў жываце. У 15—20 працэнтаў хворых узнікаюць сімптомы катару верхніх дыхальных шляхоў, якія часта не адзначаюцца імі ў ліку скаргаў.

У канцы пераджаўтушнага перыяду змяншаецца колькасць мачы, яна становіцца цёмнай. У гэты ж час назіраецца абясколерванне калу. Ён набывае гліністую афарбоўку. Жаўцеюць склеры вачэй, і захворванне пераходзіць у жаўтушную стадыю. Агульная працяглсць захворвання — 1 месяц.

Хворыя жаўтушнымі і безжаўтушнымі формамі могуць заражаць прадукты харчавання, глебу, ваду, прадметы, а цераз іх — і здаровых людзей.

Таму адзін са сродкаў, накіраваных на зніжэнне захворвання,— своечасовая (да з'яўлення жаўтухі) шпіталізацыя. Для гэтага важна ў час звярнуцца да ўрача.

Улічваючы працяглую ўстойлівасць віруса ў знешнім асяроддзі, сучасны стан водаправодных збудаванняў і магчымасць віруса праходзіць праз фільтры водаачысных збудаванняў, не выключана магчымасць распаўсюджвання і цераз пітную ваду. Таму яе лепш ужываць кіпячонай. Больш рацыянальна піць мінеральныя воды ці безалкагольныя напіткі, якія выпускаюцца прадпрыемствамі харчовай прамысловасці.

Не варта забываць пра мыццё гародніны і фруктаў, асабліва прывезеных з іншых рэгіёнаў краіны, дзе рэгіструецца высокі ўзровень захворвання (рэспублікі Сярэдняй Азіі). Хто можа гарантаваць, што ў зборы ўраджаю не мог не ўдзельнічаць хворы вірусным гепатытам з безжаўтушнай формай захворвання.

Веданне і выкананне нашых рэкамендацый дапаможа вам зберагчы сваё здароўе і здароўе сваіх блізкіх ад захворвання вірусным гепатытам «А».

С. КРЭТАВА,
загадчыца супрацьэпідэмічнага аддзялення Мінскай гарадской СЭС.








## ДА 500-ГОДДЗЯ Ф. СКАРЫНЫ

На самы пачатак верасня ў Мінску, Полацку, ды і шмат дзе яшчэ па Беларусі прыпала святкаванне Скарынінскіх дзён. Каляндар мерапрыемстваў надзвычай багаты і разнастайны. У Астраўцы, Слоніме, Навагрудку, Рэчыцы і іншых гарадах прайшлі кірмашы народнай творчасці, святы беларускай мовы, паэзіі, фальклору, скарынінскія дэкады ў бібліятэках, чытацкія і навукова-практычныя канферэнцыі.

Неўміручая вышыня асветніцтва і гуманізма Ф. Скарыны зрабіла яго тытанам эпохі Адраджэння. Ён даў «людзям простым паспалітым кнігу божую — друкаваную Біблію», пераклаўшы яе на старажытнабеларускую мову, зрабіўшы яе крыніцай мудрасці і ведаў.

Гэты фотарэпартаж прывезены з Полацка. Амаль тыдзень радзіма вялікага вучонага прымала гасцей. Свята шырока разлілося па вуліцах і плошчах старажытнага горада. Яно сабрала народных умельцаў: кавалёў, танцораў, спевакоў.

# СПАДЧЫНА НА ЎСЕ ЧАСЫ

ПОЛАЦК. Бой званоў Спаса-Ефрасіннеўскай царквы сабраў у заключны дзень гасцей і ўдзельнікаў Скарынаўскіх свят на ўрачыстую літургію. Услед за свецкімі ўшанаваннямі даніну глыбокай павагі і ўдзячнасці вялікаму земляку аддалі духавенства і веруючыя на чале з мітрапалітам Мінскім і Гродзенскім Філарэтам.

— На полацкай зямлі сёлета вялікая духоўная радасць,— гаворыць свяшчэннік айцец Дзмітрый.—І справа зусім не ў знешніх праяўленнях. Жыццё Скарыны — яркі прыклад самаахвяравання ў служэнні богу і людзям. Сваімі працамі ён садзейнічаў росквіту адукацыі славянскіх народаў. І сёння вельмі важна працягваць, умацоўваць гэтыя традыцыі, ушаноўваць вялікага асветніка не толькі словам, але і справай, учынкам. У наш неспакойны час з глыбінь стагоддзяў Францыск Скарына заклікае яшчэ і да згоды, да аб'яднання людзей на агульныя справы на славу Беларусі.

Ілюстрацыяй да слоў айца Дзмітрыя могуць паслужыць першыя заняткі ў адроджанай у Полацку нядзельнай школе, слухачы якой будуць далучацца да хрысціянскіх каштоўнасцей.

Сімвалічнай можна назваць і яшчэ адну падзею заключнага дня, скромную і строгую, на першы погляд, але глыбокую па свайму зместу. У самым цэнтры старажытнага горада пацягнуліся ў вышыню, да сонца, маладыя дубкі — першая алея будучага парку імя 500-годдзя Францыска Скарыны. Іх пасадзілі людзі розных узростаў і прафесій, розных поглядаў і веравызнання. Добрая справа заўсёды аб'ядноўвае. І ў гэтым бачыцца высокае маральнае значэнне неперахадзячай спадчыны Скарыны.

Закончыліся ўрачыстасці на беларускай зямлі. Эстафету ўшанавання Скарыны прымаюць Масква і Парыж. Па рашэнню ЮНЕСКО год дзевяносты аб'яўлены годам вялікага сына славян. І кожны, хто змог адчуць святло скарынаўскага сонца, несумненна, стаў больш узвышаным у сваіх думках і імкненнях. Дзякуй табе, Францыск, сын Скарынін з Полацька!

(БЕЛТА).

















Фота С. ВАСІЛЬЕВА.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

13 верасня
Зак. 2021.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.